ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 157 (1124) АЎТОРАК, 8-га ліпеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

Комсамол Нямеччыны вітае 16 зьезд

БЭРЛІН, 5. Цэнтральны камітэт комсамолу Нямеччы зьвярнуўся з баявым прывітаньнем 16-му зьезду ЎсеКП(б). ЦК заяўляе, што рабочая моладзь Нямеччыны і ўсяго сьвету з задавальненьнем і гонарам сочаць за грандыёзнымі посьпехамі соцбудаўніцтва СССР і за пасьпяховым выкананьнем пяцігодкі ў чатыры гады.

Польскі друк расчараваны

ВАРШАВА, 5. Польскі друк з яўным расчараваньнем паведамляе аб тым, што на 16 зьезьдзе ЎсеКП(б) цалкам перамагла генэральная ленінская лінія партыі. Газэты, якія спадзяваліся на раскол зьезду, адзначаюць, што „правадыры правай опозіцыі аказаліся зусім ізоляванымі і адступілі ў поўнай паніцы“.

Буйнымі крокамі

ПАД ВЫПРАБАВАНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (бальшавікоў) БЕЛАРУСЬ САВЕЦКАЯ ШПАРКА ІДЗЕ ДА СОЦЫЯЛІЗМУ

ДА РАБОЧЫХ, КОЛГАСЬНІКАЎ, ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ І КАМАНДНА-ПОЛІТЫЧНАГА СКЛАДУ БВА, ДА ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА, БЫЛЫХ ЧЫРВОНЫХ ПАРТЫЗАН І ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ БССР

Адозва Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

ТАВАРЫШЫ!

11-га ліпеня 1930 году спаўняецца 10 год з таго часу, як працоўныя БССР, дзякуючы гэроічнай барацьбе з імпэрыялістычнымі акупантамі слаўнай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі, непахільнаму і вернаму кіраўніцтву комуністычнай партыі, вызваліліся ад белапольскіх окупантаў. Працоўныя БССР сьвяткуюць гэтую гістарычную дату, як выключную старонку ў барацьбе за Савецкую Беларусь і СССР, старонку, якая заліта крывёю лепшых сыноў пролетарыяту, змагароў за пролетарскую рэволюцыю, аддаўшых свае жыцьцё за будаўніцтва лепшай будучыні ўсяго падняволенага чалавецтва соцыялізму.

Аб гэтым доўга не забудуць працоўныя

Працоўныя БССР добра памятаюць і яшчэ доўга не забудуць пра час гаспадараваньня на тэрыторыі Беларусі белапольскіх окупантаў. Гэтыя часы поўны жудасьці і выключнага зьверства, нячуванага соцыяльнага і нацыянальнага ўціску працоўных і адначасова гэроічнага змаганьня рабочых і сялян Беларусі за сваё вызваленьне.

Маладая Савецкая Рэспубліка, зrыху ачуняўшы ад імпэрыялістычнай вайны і нямецкай окупацыі, толькі прыступіўшы да аднаўленьня народнай гаспадаркі, была окупавана белапольскімі імпэрыялістычнымі драпежнікамі. Польскі ўлады імпэрыялізм, з дапамогай сусьветнага імпэрыялізму і выконваючы яго заданьні задушыць Савецкую Рэспубліку, прыступіў да актыўнага выкананьня сваёй контр-рэволюцыйнай ролі.

З першых-жа дзён наступленьня белапалякаў пачалася шалёная расправа над працоўнымі Савецкай Беларусі. Зьнішчалася дашчэнту ўсё, што было створана савецкай уладай за час невялікай перадышкі. Бесперапынна праводзілася рабаўніцтва і рэквізыцыі, шырокай хваляй пракаціліся пагромы, дзесяткамі і сотнямі расстрэльваліся рабочыя і працоўныя сяляне, комуністыя і комсамольцы. Усе турмы былі перапоўнены арыштаванымі, спальваліся цэлыя вёскі і гарады.

Яшчэ сьвежы ў памяці і сёньня разбураныя белапалякамі дашчэнту Барысаў, Койданава, Дукоры, напалову разбураны Менск. Вогнішчы пажараў вёсак і мястэчак і засталіся пасьля гаспадараньня белапольскіх окупантаў на Беларусі.

Працоўныя сяляне яшчэ добра памятаюць, як усьлед за белапольскімі окупантамі зьвярнуліся ў свае маёнткі абшарнікі, што былі зьменены пролетарскай рэволюцыяй. Абшарнікі ў сваю чаргу рабавалі сялян. Адбіралі жывёлу, вопратку іншую маемасьць, вышуквалі тых, хто актыўна змагаўся з панамі, помсьцілі сялянам і спальвалі цэлыя вёскі. З дапамогай беларускага кулацтва паны ладзілі шалёную расправу над рэволюцыйным сялянствам. Загуляў па сялянскіх карках шомпал і бізун.

З прыходам белапалякаў зачыняліся беларускія школы, усюды прымусова праводзілася палёнізацыя.

У тыя жудасныя часы на тэрыторыі окупаванай Беларусі актыўна дзейнічалі контр-рэволюцыйныя організацыі. Усе контр-рэволюцыянэры, у тым ліку і беларускія нацыяналістыя, дружна душылі рэволюцыйны рух, грамілі бальшавіцкія організацыі. Нацыяналістычныя організацыі адкрыта абаранялі інтарэсы кулацтва і нацыянальнай буржуазіі, распальвалі нацыянальную розьнь паміж працоўнымі беларусамі і расейцамі і фактычна служылі мэтам контр-рэволюцыі, мэтам інтэрвэнцыі. Беларускія нацыянал-дэмократы, бундаўцы, беларускія эсэры, БСГ, і шовіністыя ўсіх масьцей і колераў актыўна змагаліся супроць Савецкай Соцыялістычнай Беларусі.

Гісторыя ўтварэньня БССР добра ведае здрадніцкую ролю ў адносіне да працоўных беларускіх нацыяналістых і іншых дробна-буржуазных нацыяналістычных організацый. Яшчэ да белапольскай окупацыі ў часы існаваньня Савецкай улады на Беларусі, беларускія нацыяналістыя, працуючы ў падпольлі, шчыльна зьвязваюцца з белапольскімі легіянэрамі, пры наступленьні нямецкіх окупантаў з захапленьнем вітаюць імпэратара Вільгельма, як „збавіцеля Беларусі ад бальшавікоў“, зьвязваюцца з француcкім камандаваньнем і просяць дапамогі для ўтварэньня буржуазнай Беларусі. Беларускія нацыяналістыя ва ўсіх расправах белапалякаў аказвалі ім не малую дапамогу і з такім-жа захапленьнем, як некалі імпэратара Вільгельма, віталі маршала Пілсудзкага.

Партыя ў глыбокім падпольлі рыхтавала сілы

Толькі комуністычная партыя ў часы белапольскай окупацыі, працуючы ў глыбокім падпольлі, падпадаючы пад нячуваныя рэпрэсіі, рыхтавала сілы для барацьбы за Савецкую Соцыялістычную Беларусь. Рабочая кляса, батрацтва і бяднейшае сялянства, пад кіраўніцтвам бальшавікоў, у адказ на крывавую расправу белапалякаў організоўваюць партызанскія атрады і ўступаюць у рашучую барац бу з белапольскімі окупантамі. Партызаны гэроічна змагаліся з окупантамі і актыўна дапамагалі чырвонаармейскім часткам.

Таварышы! Вызваленьне БССР ад белапольскіх окупантаў і пасьпяховае мірнае соцыялістычнае будаўніцтва зараз сталі магчымымі толькі дзякуючы таму, што рабочыя і працоўнае сялянства Савецкага Саюзу, разам з працоўнымі Беларусі, аб'яднаныя ў Чырвонай арміі і пры актыўным удзеле партызанскіх атрадаў, пад выпрабаваным кіраўніцтвам комуністычнай партыі нанесьлі руйнуючы ўдар імпэрыялістычным драпежнікам. Толькі ў цесным зьяднаньні з рабочымі ўсяго Саюзу і пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі працоўныя БССР вызваліліся ад белапольскіх окупантаў.

Комуністычная партыя, кіруючы Чырвонай арміяй і рэволюцыйным рухам працоўных, дабілася вызваленьня БССР ад белапольскіх окупантаў і дасягнула рашаючых посьпехаў у мірным соцыялістычным будаўніцтве, пры неаслабнай барацьбе з усімі дробна-буржуазнымі нацыяналістычнымі організацыямі.

У зьвязку з абвастрэньнем клясавай барацьбы ў краіне, актывізаваліся і розныя нацыяналістыя. КП(б)Б увесь час вяла актыўную і няпрымірымую барацьбу з праявамі розных шовінізмаў і нацыяналізмаў. КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ЦК нанесла рашучы ўдар беларускаму нацыянал-дэмократызму, які зьяўляецца саюзьнікам польскага нацыянал-фашызму і грае на руку інтэрвэнцыі. Беларускія нацыянал-фашыстыя ў Заходняй Беларусі зараз адкрыта супрацоўнічаюць з фашысцкай Польшчай—агентам сусьветнага імпэрыялізму, Польшчай, якая рыхтуе ўзброены напад на Савецкі Саюз і ў першую чаргу на яго верны фарпост—Савецкую Беларусь.

Мы павінны і ў далейшым рашуча і актыўна змагацца супроць вялікадзяржаўнага шовінізму—галоўнай небясьпекі на данным этапе, супроць беларускага нацыянал-дэмократызму, які садзейнічае падрыхтоўцы інтэрвэнцыі з боку імпэрыялістых. Дзень вызваленьня БССР ад белапольскіх окупантаў павінен таксама актывізаваць усіх працоўных БССР на яшчэ больш актыўную барацьбу супроць яўрэйскага, польскага і іншых шовінізмаў, на барацьбу за цесную сувязь працоўных усіх нацыянальнасьцяў.

Зьнішчаецца спадчына мінулага

Таварышы! Пасьля белапольскай окупацыі Савецкая Беларусь пад кіраўніцтвам КП(б)Б і пры дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу шпаркімі крокамі ідзе па соцыялістычнаму шляху, па шляху матар'яльнага і культурнага ўздыму. На працягу дзесяці год пролетарыят БССР у бязьлітасных клясавых баёх з капіталістычнымі элементамі заваёўваў і ўзмацняў позыцыі соцыялізму. Творчым энтузіязмам рабочай клясы і бяднейшага сялянства зьнішчаецца спадчына праклятага мінулага. Магутнае разгортваньне соцыялістычнага будаўніцтва прывяло БССР да пераможнага наступу соцыялізму па ўсіх франтох. У гэтыя-ж часы капіталістычны сьвет знаходзіцца ў кіпцюрах крызысу, капіталістычная гаспадарка разбураецца. У краінах, дзе пануе буржуазія—расьце эканомічны заняпад.

БССР разам з усім Саюзам бурнымі тэмпамі ідзе наперад па шляху індустрыялізацыі краіны. Замест дробных прадпрыемстваў, якія засталіся ад царскіх часоў, за дзесяць год соцыялістычнага будаўніцтва на Беларусі вырасьлі буйныя фабрыкі і заводы з тысячамі рабочых. Пабудова шэрагу буйных прадпрыемстваў, перавышэньне ў два з паловаю разы вырабу прамысловасьці БССР супроць даваеннага, рост прамысловасьці супроць мінулага году на 72 проц., пабудова буйных машынабудаўнічых заводаў, пабудова першай па магутнасьці ў БССР электрычнай станцыі імя т. Сталіна, пачатак пабудовы новых, яшчэ больш магутных электростанцый яскрава сьведчаць аб шпаркім росьце соцыялізму.

У гэтыя-ж часы за межамі пад уціскам сусьветных імпэрыялістых і фашыстых стогне пролетарыят, змагаючыся за свае правы. Буржуазія ўсіх краёў, пры дапамозе соцыял-фашыстых, крывёю залівае выступленьні рабочых. Крызіс капіталізму ва ўсё большых разьмерах папаўняе шэрагі беспрацоўных, якіх налічваецца звыш 20 мільёнаў чалавек, пакінутых на жабрацтва і галодную сьмерць. Абвастраецца і паглыбляецца клясавая барацьба.

У БССР толькі за апошнія два гады пролетарыят павялічыўся ў два разы, вырасла і ўзмацнілася роля рабочай клясы, беспрацоўе значна зьмяншаецца. За 1928-29 г. колькасьць беспрацоўных зьменшылася на 47 проц. Новае будаўніцтва ахоплівае ўсё большую і большую колькасьць працоўных. Матар'яльнае забесьпячэньне рабочай клясы з кожным годам паляпшаецца. Узросшая актыўнасьць рабочай клясы, сталёвая воля і творчы энтузіязм пролетарыяту, накіраваны да канчатковай перамогі соцыялізму праз соцспаборніцтва і ўдарніцтва далі магчымасьць выконваць лёзунг „пяцігодка—у чатыры гады“.

Пашыраецца і расьце база соцыялізму

Палітыка індустрыялізацыі і рост прамысловасьці забясьпечылі кіруючую ролю пролетарыяту ў рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Працоўнае сялянства на справе пераканалася ў перавазе буйнай соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. На аснове масавага руху да колектывізацыі партыя перайшла да палітыкі ліквідацыі ў СССР апошняй капіталістычнай клясы—клясы кулацтва, на базе суцэльнай колектывізацыі. БССР мае значныя посьпехі ў справе колектывізацыі. На сёняшні дзень мы маем 15,7 проц. колектывізаванай пасеўнай плошчы. Новыя шэрагі колгасьнікаў ідуць у бойку за соцыялізм. Вёска цьвёрда павярнула на соцыялістычны шлях. Пашыраецца і расьце база соцыялізму.

У гэтыя-ж часы буржуазія зброяй і агнём падаўляе ўсялякі нацыянальна-вызваленчы рух. Над працоўнымі Індыі, Кітаю і ўсіх коленій і поўкалёній робяцца крывавыя расправы і яны ўвесь час жывуць пад пагрозай бізуна сусьветнага імпэрыялізму. З зброяй у руках цэлыя народы і плямёны павінны адваёўваць свае правы на самастойнае існаваньне. На „культурным“ Захадзе маюць месца жудасныя пагромы, нацкоўваецца нацыя на нацыю.

Працоўныя БССР павінны памятаць, што ў Заходняй Беларусі польскія фашыстыя пры дапамозе беларускіх нацыянал-фашыстых зьдзекуюцца над працоўным насельніцтвам. Рэволюцыйны рух бязьлітасна падаўляецца. Беларускія школы зачыняюцца, ідзе гвалтоўная палёнізацыя.

Таварышы! Перамога пролетарскай рэволюцыі на Беларусі дала магчымасьць росквіту беларускай пролетарскай культуры. Стварэньне Акадэміі Навук, дзяржаўнага унівэрсытэту, організацыя навукова-дасьледчых інстытутаў і шэрагу вышэйшых і сярэдніх навучальных установаў, тэатраў, разьвіцьцё беларускай пролетарскай літаратуры, друку, увядзеньне ўсеагульнага навучаньня сьведчаць аб правільным вырашэньні нацыянальнага пытаньня партыяй Леніна.

Разам з тым пашыраецца і расьце культура працоўных нацменшасьцяй на Беларусі. Рост яўрэйскай, польскай, літоўскай пролетарскай літаратуры, організацыя дзяржаўнага яўрэйскага і польскага тэатраў, выданьне газэт на мовах нацменшасьцяй і пашышырэньне школ на іх мовах узмацняе братэрскі саюз працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

ПРАЦЯГ ГЛЯДЗІ НА 2-Й СТАРОНЦЫ

XVI ЗЬЕЗД УсеКП(б)

СПРАВАЗДАЧА ДЭЛЕГАЦЫІ УсеКП(б) У ВККІ

Даклад тав. Молатава*)

Раніашняе пасяджэньне дзесятага дню 16-га зьезду ЎсеКП(б) 5 ліпеня адчынянецца пад старшынствам тав. Андрэева. Слова даецца тав. В. М. Молатаву для справаздачы дэлегацыі ЎсеКП(б) у выканкоме Комінтэрну.

Тав. Молатаў кажа:

Гістарычны этап, які быў пройдзен в часу 15 зьезду нашай партыяй, мае выключнае значэньне. Разбурэньне капіталістычнай стабілізацыі, якое і цяпер адбываецца выклікала экономічны крызіс. На грунце крызісу абвастраюцца ўсе капіталістычныя супярэчнасьці: унутры капіталістычных краін, паміж рознымі капіталістычнымі краінамі, паміж капіталістычнымі краінамі і колёніямі. Растуць элемэнты фашызму. Абвастраецца клясавая барацьба. Нарастаюць элемэнты рэвалюцыйнага ўздыму. Усё гэта ставіць работу компартый і Комінтэрну ў новыя ўмовы і вымагае асаблівага прыстасаваньня формы і мэтадаў гэтай работы да новых умоў.

У работах 6 кангрэс Комінтэрну даў аналіз становішча і вызначыў пэрспэктывы на бліжэйшы час, якія поўнасьцю пацьвердзіліся за мінулы пэрыяд: пастановы Комінтэрну прымаліся ў барацьбе з рознымі відамі апартунізму, асабліва з правым апартунізмам.

Найбольш яскравым фактам апошняга часу зьяўляецца ўзрастаючы крызіс капіталізму, які выяўляецца ў сусьветным экономічным крызісе. Аналіз гэтага крызісу з вычэрпваючай поўнасьцю дадзен у дакладзе т. Сталіна. Па гэтым пытаньні трэба будзе абмежавацца некалькімі заўвагамі і лічбамі.

Сусьветны гандлёвы зварот значна скараціўся. Не зважаючы на зьніжэньне аптовых цэн у шмат якіх краінах, узровень жыцьця не павышаецца. Рэальны заработак у шмат якіх краінах стаіць ніжэй даваеннага ўзроўню. Беспрацоўе нястрымна расьце. Яшчэ нядаўна агульная лічба беспрацоўных у капіталістычных краінах дасягала 17 мільёнаў чалавек. У сучасны момант колькасьць беспрацоўных перавышае ўжо 20 мільенаў. У Злучаных Штатах беспрацоўных 6-7 мільёнаў, у Нямеччыне—5, у Англіі—больш за 2. У далейшым, як бачым, беспрацоўе яшчэ больш узрасьце.

Экономічны крызіс, які ўсё больш і больш набывае характар сусьветнага праходзіць на базе агульнага крызісу капіталізму. Адзіны фронт імпэрыялізму быў прарваны яшчэ ў часе вайны. Ў Расіі адбылася Кастрычнікавая рэволюцыя. Поруч з імпэрыялістычнымі краінамі будуецца і ўмацоўваецца социялізм. Гэта зьяўляецца адным з самых грунтоўных фактараў, якія падрываюць імпэрыялізм.

Яшчэ на 15-м зьезьдзе нашай партыі тав. Сталін казаў, што з росту вытворчасьці і абмежаванасьці рынку няўхільна вырастае новы крызіс. Гэты пункт гледжаньня адлюстравауся і разьвіўся ў пастанове 6 конгрэсу Комінтэрну, які даў аналіз так званага трэцяга пэрыяду разьвіцьця капіталізму. Правыя яшчэ тады намячалі іншую пэрспэктыву і змазвалі абвастрэньне супярэчнасьцяў. Асабліва гэта адбілася ў першапачатковым процэце тэзісаў тав. Бухарына да 6 конгрэсу. Цяпер, пасьля адбыўшыхся падзей асабліва зразумела наколькі была патрэбна рашучая барацьба з гэтай опортуністычнай концэпцыяй Бухарына

Такія лідэры соцыял-дэмократыі, як Гільфэрдынг, былі аўтарамі так званай „тэорыі організаванага капіталізму". Бухарын, ідэолёг правых, усхваляў тую-ж тэорыю ў крыху зьмененым выглядзе.

„Левыя" опортуністыя рабілі талія-ж грубыя памылкі, якія прыводзілі іх да тых жа вывадаў, як і правых. Троцкі ў сваёй кнізе надрукаванай яшчэ ў 1926 годзе, гаварыў, што капіталізм ня мае ніякіх пэрспэктыў, апроч поўнага застою і развалу. Аднак гэты знадворны крайні левы пункт гледжаньня не перашкодзіў Троцкаму абярнуцца ў пяўца амэрыканскага „проспэрыты". Тав. Бухарын ухітрыўся сумяшчаць абодвы пункты гледжаньня, і „левы", і правы, як гэта ўласьціва „сапраўдным" эклектыкам.



Сусьветны крызыс з выключнаю сілаю абвострыў супярэчнасьці. З аднаго боку мы наглядаем за апошнія гады значную колькасьць прамысловых і гандлёвых дагавораў паміж капіталістычнымі краінамі, ня выключаючы нават згоды паміж Францыяй і Нямеччынай. З другога боку, расьце тэндэнцыя адмежаваньня ўнутраных рынкаў і нязвычайна ўзмацняецца протэкцыянізм. Характэрна тое, што Злучаныя Штаты перайшлі да політыкі далейшага прасоўваньня тарыфаў. Дзесяткі краін і больш тысячы амэрыканскіх экономістых протэставалі супроць гэтага мерапрыемства. Аднак тарыфы на с.-г. прадукты на каляровыя мэталі і інш. павялічыліся ў Амэрыцы—на 30-35 проц. Англія зьяўляецца арэнаю суровай барацьбы за стварэньне імпэрскага мытнага бар'еру, які адмяжоўвае Англію з усімі яе колёніямі. У Эўропе гэту дзейнасьць найбольш шырока разгарнула Францыя. Ідэя пан-Эўропы перш-на-перш практычна выяўляецца ў падрыхтоўцы эўрапэйскага мытнага саюзу на чале з Францыяй.

Супярэчнасьці паміж Злучанымі Штатамі і Англіяй, якія зьяўляюцца асноўнымі ў сучасны момант, ня толькі не скарачаюцца, але ўвесь час узрастаюць. Амэрыка пераносіць цэнтр сваёй увагі на заваеваньне замежных рынкаў. Разгортваецца сапраўдная барацьба за гегемонію. Падрыхтоўваецца новая сусьветная вайна. Такія публіцыстыя амэрыканскага імпэрыялізму, як напр. Дэні, завяраюць, што магчымасьць вайны ўсё ўзрастае. Вайна 1914-18 г.г. была вайной пераважна эўрапэйскай. Вайна, якая падрыхтоўваецца зараз, у значнай ступені будзе вайной сусьветнай, бо ўплыў Англіі і Злучаных Штатаў распаўсюджваецца на ўсе контынэнты.

Міжнароднае становішча СССР таксама вельмі добра ахарактарызавана ў дакладзе тав. Сталіна.

На фоне сусьветнага крызісу расьце рэволюцыйны рух. Ён ахапляе паступова ўсе краіны. Распаўсюджваецца на Індакітай, Паўднёвую Амэрыку, Афрыку, Палестыну і інш. У Індыі расьце абурэньне мас, пашыраецца забастовачны рух. Мы маем там першыя спробы заснаваньня масавых рабочых організацый, заснаваньня рэволюцыйных профэсыянальных саюзаў. Такія факты, як паўстаньне ў Пэшавары, выступленьні сялян у шмат якіх раёнах, выпадкі далучэньня часьцей арміі да рэволюцыйных выступленьняў, гавораць аб узмацненьні рэволюцыйнага руху. Для кіраўніцтва гэтым рухам патрэбны правадыры, патрэбна стварэньне камуністычнай партыі Індыі, якой яшчэ няма, але якая засноўваецца. У Кітаі мы маем новы рэволюцыйным уздым. Пэсымістыя і малаверы, якія гаварылі пра крушэньне кітайскай рэволюцыі, пабіты фактамі. З 638 паветаў у Кітаі 241 ахоплена рэволюцыйнымі рухамі. З канца 1928 году існуе 19 савецкіх раёнаў. У Кітаі налічваецца 14 карпусоў Чырвонай арміі і шматлікія партызанскія атрады. Барацьба разгортваецца пад сьцягам змаганьня за Саветы. Калі папярэдні рэволюцыйны ўздым у Кітаі паказаў, што тагочасная кітайская комуністычная партыя не стаяла на належнай вышыні, дык сучасны рэволюцыйны ўздым сьведчыць аб тым, што компартыя ўсё больш становіцца на ногі і здабывае здольнасьць па бальшавіцку праводзіць змаганьне. Гэты факт мае вялізарнае значэньне.

У створаных умовах, як ніколі, выразна відаць клясавы характар буржуазнай улады. Буржуазныя міністры і кіраўнікі буржуазнай політыкі, вельмі часта зьяўляюцца адначасна кіраўнікамі буйнейшых монополістычных прадпрыемстваў. „Рабочы" ўрад Макдональда ў Англіі і сацыял-дэмократычны—на чале з Мюльлерам—у Нямеччыне зусім ня супярэчыць гэтаму становішчу, а толькі пацьвярджае яго. Буржуазія ставіць, калі ёй патрэбна, на чале ўраду соцыял-дэмократаў або лідэраў рабочай партыі, дзеля таго, хаб ахоўваць свае пазіцыі і сваё панаваньне, дзеля таго, каб трымаць рабочых у няволі.

Тав. Ленін яшчэ ў 1910 годзе адзначыў, што ў буржуазеі ёсьць два мэтады ў змаганьні за панаваньне—мэтад гвалту, і мэтад лібэралізму. Абодвы гэтыя мэтады скарыстоўваюцца ёю і ў сучасны момант у форме фашызму, форме коаліцыі з с.-д. Розьніца толькі, што мэтад гвалту фашызму ўсё больш разьвіваецца, а сама с.-д. становіцца яго апорай. Роля с.-д. у многіх краёх зводзіцца да ідэолёгічнай падрыхтоўкі і фашызацыі. С.-д. выпрацавала ідэолёгію аховы буржуазнага панаваньня „захаваньня вышэйшага цэлага" і адкрыта гаворыць аб неабходнасьці падпарадкаваньня інтарэсаў пролетарыяту інтарэсам захаваньня капіталізму. У Англіі на другі дзень пасьля прыходу да ўлады ўраду Макдональда было праведзена зьніжэньне заработнай платы тэкстыльшчыкаў. У Францыі Поль Бонкур адкрыта заявіў, што ні мінуты ня стаў бы хістацца ў выбары паміж інтарэсамі „майго краю" і „маёй партыі", ставячы вышэй падтрыманьне капіталістычнай Францыі. Супроць бальшавізму і за панаваньне буржуазіі, за адзінства з буржуазіяй—вось лінія с.-д., якая ідзе па шляху фашызацыі.

За апошні час у радох Камінтэрну ўзмацніліся таксама „левыя" тэндэнцыі і сэктанцкія настроі, якія прыводзяць да няправільных вывадаў, нясумяшчальных з лініяй Комінтэрну. Каранной памылкай „левых" зьяўляецца тое, што яны ня робяць розьніцы паміж верхавінкай с.-д. і рабочай масай, якая ідзе за с.-д. Між тым Комінтэрн настойліва паказаў, што важнейшай нашай задачай зьяўляецца тое, каб аддзяліць рабочых, ідуць за с.-д. ад яе верхавінкі.

З канца 1928 году вызначыўся ...шучы пералом у нарастаньні рэ... цыйнага руху. Да гэтага часу такія падзеі, як усеагульная заба... ка ў Англіі у 1926 г. заставаліся ...кі ізоляванымі зьявішчамі. У с... ны момант нарастаньне забастов... га руху ў Францыі, Англіі, П... Аўстраліі і краёх Усходу зьяўл... бясспрэчнай адзнакай пералому. ... забастоўкі набываюць усё бол... палітычнае значэньне.

Але нават там, дзе яны маюць ... номічны характар, яны прапяк... як правіла пад кіраўніцтвам ... стых і рэволюцыйных профсаюз... накіраваны супроць трэстага ... прадпрыемцаў, буржуазнае дзяр... і с.-д. Вялізарныя дэмонстрацыі ... няга часу, а таксама выступ... беспрацоўных усё больш носяць ... рактар рэволюцыйных выступлен... Часта яны пачыналіся, або канч... сутычкамі з узброенай паліцыяй ... ахвяр рабочае клясы ў гэтых с... ках вялікі. За мінулыя месяцы 1... налічваецца 60 забітых, 1163 п... ных, 2614 арыштаваных у адной ... меччыне. Бясспрэчна буйнейшае ... чэньне міжнароднага руху маюць ... кія выступленьні, як дэмонст... першага мая 1929 і 1930 г., д... страцыя супроць вайны 1 ж... 1929 году, дэмонстрацыя супроць ... працоўя 6 сакавіка бягучага году ... ват у фашысцкай Італіі, дзе рабоч... натыкаецца на вельмі вялікія ... касьці, 1 мая баставала большая ... стка міланскіх рабочых, ня гледз... тое, што напярэдадні было ... тавана 3000 рабочых.

У апошні час трэба адзначы... большае ўцягваньне бядняцкіх ... скіх элемэнтаў у рэволюцыйны ... У Польшчы сялянская беднага ... ных месцах прымала ўдзел у ... майскіх выступленьнях. У Грэц... бываліся шматлікія дэмонстра... якіх прымалі ўдзел сяляне.

Калі да ўсяго гэтага дадаць ... ў колёніяльных краёх, дык буд... люнак, які сьведчыць аб усё бо... нарастаньні ўздыму рэволюць... руху. Сусьветны крызіс у дал... яшчэ больш будзе ўзмацняць ... ты рэволюцыйнага ўздыму, зма... рабочае клясы супроць капіталі...

Адначасова з гэтым трэба ... чыць распачатае новае наступ... капіталу на рабочую клясу. Зьн... не зарплаты мас месца ня то... Нямеччыне, яно праводзіцца ... шых краёх. У ПАЗШ право... таксама ўзмоцненая падрыхтоў... такога зьніжэньня. У сувязі з ... пытаньне аб кіраўніцтве эконом... баямі рабочае клясы набывае вы... нае значэньне. Адсюль важ... справы самастойнага кіраўніцтв... номічным змаганьнем рабочых ўмацаваньня організацыйных ... цый компартый у масавым ра... руху.

Асноўнай задачай зьяўляецца ... часны момант—задача заваёвы ... шасьці рабочае клясы ў бок ... нізму. Партыя павінна змага... рабочыя масы ўсюды, дзе яны ... Рост уплыву компартый у ра... масах трэба замацаваць. Адсюль ... чы ўзмоцненай работы па ор... цыйным умацаваньні компартый ... цаваньні і выхаваньні кадраў ... Галоўным ворагам у справе ... ваньня большасьці рабочае ... зьяўляецца опортунізм. Пасьля ... грому трацкізму правы ўхіл ... застаецца галоўнай небясьпекай ... проць якой прыходзілася змага... Нямеччыне, ПАЗШ, Швэцыі, ... Чэхіі і Польшчы. У змаганьні з ... вым ухілам многім партыям пры... перамагаць значныя цяжкасьці. ... часова трэба было змагацца ... роць „левых" настрояў. Ас... значэньне „левыя" сэктанцкія ... мелі і маюць у організацыях ... Тут яшчэ няма поўнага пера... практычнай рабоце. Змаганьне ... фрацты было і застаецца самай ... умовай далейшага росту Комун... нага Інтэрнацыяналу. Яно дал... вынікі і дасьць яшчэ большыя ў... ве аўладаньня рабочай масай ... мацаваньня комуністычнага ўпл...

Змаганьне за ўмацаваньне ко... тый павінна быць зьвязана з пэ... тывай разгортваньня змаганьня ... чае клясы за заваяваньне ўлады ... пэрспэктыва ўгрунтавана на пр... Комуністычнага Інтэрнацыяналу, ... левай VI кангрэсам. У СССР ... ем ужо прыклад дасканалага яе ... цяўленьня на справе. Сусьветны ... зіс адкрывае вялізарныя пэрспэ... перад рабочай клясай. Комуніст... партыі за мінулы пэрыяд значна ... цаваліся, гэта стварае прадп... для перамог.

Апіраючыся на рух шырокіх ... чых мас, трэба дабіцца, каб но... волюцыйны ўздым абярнуўся ў ... летарскую рэволюцыю.

*) Дадзен у скарочаным выглядзе.

АДОЗВА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б

(ПРАЦЯГ)

быць на чаку!

Таварышы! Толькі дзякуючы ленінскай політыцы КП(б)Б і УсеКП(б) і рашучай барацьбе за генэральную лінію партыі супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць „левых" загібаў і прымірэнства да ухілаў, Савецкая Беларусь дасягнула нябачных посьпехаў у гаспадарчым і нацыянальна-культурным будаўніцтве. Разам з усімі савецкімі рэспублікамі Саюзу, БССР пераможна змагаецца за соцыялізм. Тэмпы будаўніцтва БССР пры вялізарнейшай дапамозе СССР забясьпечваюць ператварэньне Беларусі з краіны гаспадарча-адсталай у краіну са шпарка ўзрастаючай прамысловасьцю.

Таварышы! Бурны рост краіны соцыялізму праходзіць ва ўмовах, калі капіталізм задыхаецца ў ціскох экономічнага і політычнага крызісу. Рост СССР выклікае зьвярыную нянавісьць буржуазіі да першай у сьвеце пролетарскай дзяржавы. Капіталістыя ўсяго сьвету ліхаманкава рыхтуюцца да ўзброенага нападу на СССР. Комуністычная партыя, пасьлядоўна праводзячы політыку міра, заклікае працоўных да ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны праз барацьбу за выкананьне і перавыкананьне промфінпляну, ажыцьцяўленьне лёзунгу партыі „пяцігодка ў чатыры гады", правядзеньне далейшай колектывізацыі сельскай гаспадаркі, за бязьлітасную барацьбу з клясавымі ворагамі.

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры і політработнікі!

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі Чырвоная армія ў крывавых бойках з польскім імпэрыялізмам вызваліла дзесяць год таму назад Савецкую Беларусь. Працоўныя БССР будуючы соцыялізм будуць упарта рыхтавацца да рашучага адпору ворагам пролетарскай дыктатуры. Памятайце гэроічныя традыцыі Чырвонай арміі і цьвёрда стойце на варце будаўніцтва соцыялізму, аўладайце ўсёй вайсковай тэхнікай, каб у патрэбны момант разам з усёй рабочай клясай, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, даць руйнуючы адпор сусьветнаму імпэрыялізму.

Таварышы рабочыя і работніцы!

У дзень дзесятай гадавіны вызваленьня ад белапольскай акупацыі яшчэ больш згуртаванымі шэрагамі, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, няўхільна змагайцеся за выкананьне і перавыкананьне промфінпляну. Накіроўвайце агонь пролетарскай самакрытыкі супроць шкоднікаў соцыялістычнага будаўніцтва, узьнімайце на вышэйшую ступень соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Таварышы колгасьнікі! Разьвіцьцё колектывізацыі сельскай гаспадаркі вырывае глебу з-пад капіталістычных элемэнтаў. Памятайце, што перад вамі пад кіраўніцтвам партыі стаіць задача пераводу дробнай сельскай гаспадаркі на рэйкі буйнай соцыялістычнай гаспадаркі. Кулак шалёна супраціўляецца, бо ён ведае, што колектывізацыя азначае яго канчатковую пагібель. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б давайце жорсткі адпор усім вылазкам клясавых ворагаў. Сустракайце ўборачную кампанію і асеньнюю сяўбу організаванымі, упэўненымі ў пераможную сілу колектыўнай працы.

Таварышы батракі, беднякі і серадзякі! Савецкая Беларусь дзесяць год таму назад вызвалілася ад белапольскіх легіёнаў, якія абаранялі інтарэсы абшарніка і кулака. БССР будуе новае жыцьцё. Коліктывізацыяй зьнішчаюцца межы і руйнуюцца дробныя і драбнюткія гаспадаркі пры вялізарнейшай актыўнасьці працоўнага сялянства. Батракі, беднякі і серадзякі ведаюць, што толькі разьвіцьцё колгасаў, рост буйнай аграмаджанай гаспадаркі вызваліць працоўнае сялянства ад цемры, што толькі на шляху соцыялізму забясьпечваецца нябачны ўздым матар'яльнага і культурнага дабрабыту працоўнага сялянства.

Таварышы былыя чырвоныя партызаны і ўсе ўдзельнікі вызваленьня БССР!

Працоўныя Беларусі памятаюць вашу адданасьць і гэроізм у справе вызваленьня БССР ад банд сусьветнага капіталізму. КП(б)Б заклікае вас да далейшага ўдзелу ў пераможным соцыялістычным будаўніцтве. Пільна сачыце за падрыхтоўкай імпэрыялістычнымі драпежнікамі нападу на Савецкі Саюз, папаўняйце свае вайсковыя веды з тым, каб у патрэбны момант быць гатовым са зброяй у руках абараняць рэспубліку саветаў.

Няхай жыве комуністычная партыя—адзіны кіраўнік і організатар пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва!

У дзень дзесяцігодзьдзя вызваленьня БССР ад белапольскіх окупантаў наша братэрскае прывітаньне працоўным Польшы і Заходняй Беларусі, якія гэроічна змагаюцца з польскім фашызмам!

Гарачае бальшавіцкае прывітаньне КПЗБ — актыўнаму змагару з польскім фашызмам і беларускім нацыянал-фашызмам!

Няхай жыве Чырвоная армія—змагар за Савецкую Беларусь!

Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве Комінтэрн!

Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі.

Перавыбары саюзных органаў

Ня плавайце ў аблаках,

А НАВУЧЭЦЕСЯ ЗНАХОДЗІЦЬ ЦЭНТРАЛЬНАЕ ЗЬВЯНО І ПАДПАРАДКАВАЦЬ ЯМУ УСЮ РАБОТУ

Бюро многіх ячэек і колектываў не змаглі мобілізаваць масы на важнейшыя задачы работы саюзу. Рашэньні ЦК УсеЛКСМ і ЦК КП(б)Б аб становішчы Беларускай організацыі шмат дзе не даведзены да мас

РАЗГОРТВАНЬНЕМ САМАКРЫТЫКІ РАЗЬБІВАЦЬ МАЛЕЙШЫЯ СПРОБЫ ОПОРТУНІСТЫЧНАГА СКАЖЭНЬНЯ ЛІНІІ САЮЗУ

НА ШЛЯХУ ДА ВЫПРАЎЛЕНЬНЯ ПРАРЫВАЎ

Сыгнал „Чырвонай Зьмены“ пачулі

Самаправерка ў Барысаўскай організацыі ЛКСМБ толькі пачалася. Яна нарадзілася ў муках. Масы комсамольцаў ня былі сваечасова асьвядомлены аб політычнай важнасьці гэтай работы. Гэта здарылася таму, што **райком комсамолу ня здолеў сваечасова ўлічыць прарывы ў рабоце організацыі і актыў організацыі не дааацэньваў політычнай важнасьці гэтай работы.**

Артыкул у „Чырвонай Зьмене“ ад 23 чэрвеня зьявіўся сыгналам. Ён прымусіў узварахнуцца. Трэба адзначыць, што райком правільна зразумеў сыгнал „Чырвонай Зьмены“ і ў дзень атрыманьня газэты было склікана ўнечарговае пасяджэньне бюро РК з актывам. На гэтым пасяджэньні абгаварылі становішча організацыі, потым склікалі кустовыя сходы ячэек у горадзе дзе таксама было пастаўлена гэта пытаньне. **Райком і актыў самакрытычна падышлі да становішча работы організацыі і толькі гэта дазволіла ім мобілізаваць масы, загадаць, загаварыць аб сваіх недахопах, прарывах у ячэйках паасобных прадпрыемстваў.**

Кустовыя сходы і сходы актыву былі штурхачамі для пачатку самаправеркі, былі сходамі выяўленьня сапраўднага твару організацыі.

У чым-жа заключаюцца прарывы ў рабоце організацыі? Самае галоўнае ў тым, што **організацыя несваечасова пераключылася ў сваёй рабоце да выкананьня дырэктываў партыі ў рэконструкцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, у тым, што колектывы буйнейшых фабрык і заводаў Барысаву, як запалкавая фабрыка „Перамога“, шкляная гута „Домбаль“ не мобілізавалі масы комсамольцаў і моладзі на выкананьне прамфінпляну, што яны ня здольны аказаліся пабудаваць сваю работу так, каб з найбольшым эфэктам выхоўваць новую моладзь на прадпрыемстве, не змаглі адпаведна гэтаму пабудаваць усю культурна-выхаваўчую работу.**

Райком несваечасова рэагаваў на бязьдзейнасьць шэрагу ячэек: „Профінтэрн“, „Комбінат“, „Рабочы“, „Будаўнік“, „Чыгунка“.

Пастанова ЦК УсеЛКСМ аб Беларускай організацыі і пастанова студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б ня былі прапрацаваны ў шырокіх колах комсамольцаў і рабочай моладзі. Надта слаба была разгорнута крытыка і самакрытыка, што не дало мажлівасьці сваечасова выкрываць недахопы і прарывы.

Усё гэта разам узятае яскрава паказвае на тое, чаму дрэнна ў організацыі быў праведзен месячнік беларускай пролетарскай і нацменаўскай культуры, чаму райком у перабудове форм комсамольскай работы абмежаваўся толькі пастановай, чаму былі спробы самаправерку мас ператварыць у „рэвізію адзінак“.

Райком і організацыі ўзварушыліся і зараз ідуць па шляху выпраўленьня памылак, а аб гэтым сьведчаць кустовыя сходы ячэек моладзі па цэхах, аб гэтым сьведчыць і апошні сход актыву раённай організацыі, аб гэтым сьведчыць таксама і пасылка гарадзкой брыгады комсамольцаў у ліку 25 чалавек для правядзеньня самаправеркі ў вайсковай ячэйцы комсамолу. Праводзіцца організацыя налётаў „лёгкай кавалерыі“ на сельсаветы, колгасы, саўгасы для праверкі падрыхтаванасьці іх да уборачнай кампаніі. Да гэтай работы прыцягнута каля 45 чалавек.

Брыгадзір „Чырв. Зьмены“ **Мікола Адзінец.**

Слабая дапамога

У комсамольскім колектыве фабрыкі „Вэзуві“ (Нова-Беліца Гомельшчына) пачалася самаправерка. Ячэйкі правялі сходы, на якіх складзены добраахвотныя брыгады, а таксама організавана брыгада па агляду савецкай ячэйкі пры ЦРК Нова-Беліцкага раёну. Па цэхах з беспартыйнай моладзьдзю былі праведзены гутаркі па пытаньнях—справаздачна-перавыбарчай кампаніі бюро ячэек і росту комсамолу; выпушчаны лістоўкі.

Трэба адзначыць, што з боку цэхавых парт'ячэек адчуваецца слабая дапамога комсамольскім ячэйкам у падрыхтоўцы і правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі бюро ячэек.

Гурары, Гузоўскі.

Ловіць рыбку, але ня тую



Шэраг ячэяк і колектываў праходзілі міма важнейшых задач, кіраўніцтва іх не мабілізавала масы навакол цэнтральнага зьвяна работы саюзу.

Міма асноўных задач

Комсамольскі колектыў Менскага ЦРК налічвае 120 чалавек. Здавалася, што сярод такой масы комсамольцаў павінна была-б весьціся вялікая праца, але мы бачым, што яе няма. Міма працы колектыву прайшлі такія політычныя мерапрыемствы, як чыстка апарату, соцспаборніцтва, ударніцтва і г. д. Навокал гэтых мерапрыемстваў комсамольцы не концэнтравалі сваёй увагі. Меліся выпадкі, калі на чыстцы апарату ня прысутнічала ніводнага сэкратара ячэйкі, а па прыкладу іх ніводнага комсамольца.

Соцспаборніцтва і ўдарніцкі рух праходзілі міма ячэйкі і ў выніку маюцца выпадкі, што комсамольцы не разумеюць значэньня соцспаборніцтва. Напрыклад, быў выпадак у першай ячэйцы ЛКСМБ калі комсамолец Гольдбэрг адмовіўся стаць ударнікам з за таго, што ён атрымлівае малую зарплату. Слабое кіраўніцтва з боку бюро колектыву ячэйкамі спрыяла слабасьці іх работы. Комсамольскі колектыў павінен быў абслугоўваць каля 100 чалавек моладзі працуючай у ЦРК. Напрыклад за годы работы колектыву ён вырас на 6—7 чалавек, і то за лік піонэраў.

Па ячэйках маецца баласт—комсамольцы адарваны ад усякай комсамольскай работы. Напрыклад, у першай ячэйцы Дзедзіна зусім адарвалася ад работы, не наведвае сходы, пачала пудрыцца, красіцца, комсамольскім жыцьцём ня цікавіцца Бюро ячэйкі знайшло выхад з гэтага становішча і на адным з пасяджэньняў вынесла пастанову аб выключэньні яе з комсамолу. Такіх, як Дзедзіна ня мала. Гольдбэрг, Левіна, Ханчык і інш. Карэньні гэтага—у пастаноўцы работы ячэйкі.

Пасяджэньне бюро колектыву праходзіць бяз удзелу мас і таму аб усіх рашэньнях ведаюць сябры бюро. Да мас яны даходзяць ня хутка. З прыходам лета работа колектыву яшчэ горш паслабла. У першай ячэйцы, напрыклад, ужо два месяцы ня было сходу. Членскія ўзносы некаторымі ня плоцяцца па некалькі месяцаў. Прапрацоўкай тэзісаў да XVI партзьезду не займаліся. Комсамольскі колектыў аб гэтым ведае, але не рэагуе.

Усе гэтыя прыведзеныя факты гавораць, што колектыў далёка не на сваім месцы. Дзяляцтва, бязьдзейнасьць—вось што пануе ў комсамольскім колектыве МЦРК. **Смоткін.**

Гналіся за колькасьцю,—упусьцілі якасьць

Справаздачна-перавыбарчыя сходы цэх. ячэек комсамольскага колектыву заводу «Зьвязда» (Мазыршчына) праходзілі пад знакам крытыкі вытворчай працы ячэек. Сходы паказваюць, што ячэйкі хаця і займаліся пытаньнямі ўдарніцкага руху, але мала займаліся паляпшэньнем якасьці працы ўдарных брыгад. Шмат брыгадзіраў лічыцца на паперы. Работа брыгад не на вышыні свайго становішча. Комсамольскі-ж колектыў ставіў пытаньне аб 100-процантным ахопе ўсіх **комсамольцаў ударнымі брыгадамі, упускаючы пытаньне якаснай працы брыгад.**

Таму мы маем, што пры 8-гадзінным працоўным дні комсамольцы давалі лепшыя паказчыкі, чым-ся пасьля пераходу на 7-гадзінны працоўны дзень. Паказчыкі за май і чэрвень **зьяўляюцца пагражаючымі** па недавыкананьню прамфінпляну, асабліва па выпрацоўцы экспортнай фанэры.

Гэтыя майскія і чэрвеньскія прарывы павінны былі быць пастаўлены ў аснову барацьбы за паляпшэньне якаснай працы ўдарных брыгад, чаго яшчэ, нажаль, ня зроблена. А зрабіць гэта трэба і зрабіць безадкладна.

П. Прыпяцкі.

НАПЯРЭДАДНІ ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ

У АТАКУ НА ЛЕЖАБОКАЎ І ШТАМПАВАЛЬШЧЫКАЎ!

Віцебскі акругком, Чэрвенскі і Вузьдзенскі райкомы ЛКСМБ далей прыгожых рэзолюцый і абежнікаў аб уборачнай кампаніі не пайшлі

Ударным правядзеньнем уборачнай кампаніі замацуем і забясьпечым далейшы колгасны рух і нанясем руйнуючы ўдар кулаку і яго агэнтам —правым ухілістым

ВУЗЬДЗЕНЦЫ, ХОПІЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ!

У колгасе „Калінінск“ і комуне „Чырвоны Сейбіт“ Вузьдзенскага раёну пытаньне ўборкі ўраджаю абгаворана на вытворчых нарадах і на групах беднаты. У гэтых-жа колгасах закончан рамонт усяго сельска-гаспадарчага інвэнтару.

Але гэта адзінкі ў раёне. **Іншыя колгасы ў сваёй большасьці яшчэ не падрыхтаваліся да гэтай кампаніі. Шмат якія нават не забясьпечаны граблямі і сярпамі.**

„Клапатлівы“ старшыня

Старшыня райпаляводсаюзу толькі 30 чэрвеня „паклапаціўся“ аб тым, каб загатаваць патрэбны сельска-гаспадарчы інвэнтар для ўборкі, у той час, калі ў большасьці саўгасаў і колгасаў была разгорнута ўборка сенажаці. Райпаляводсаюз нават не пацікавіўся становішчам рамонту машын у колгасах.

Аб дапамозе бядняцкім гаспадаркам і гаспадаркам сем'яў чырвонаармейцаў паляводсаюз і комітэт узаемадапамогі покуль што не падумалі.

Комсамольская організацыя раёну спачывае на лаўрах і ня думае аб падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі.

На фэст за 15 вёрст.

У часе вясеньняга севу мы мелі такія факты: **Колгасы і саўгасы выходзяць на работу, а комсамольцы запрагаюць коняй і едуць на фэст за 15 вёрст.** Комсамольцы ў колгасах не сталі на чале організацыі ўдарных брыгад, разгортваньня соцспаборніцтва і г. д.

У вёсцы **Бярвішчы** колгас распаўся толькі таму, што комсамольская ячэйка, якая знаходзіцца на адлегласьці паўкілёмэтру, не змагла даць рашучага адпору кулакам і падкулачнікам, якія сваёй агітацыяй развалілі колгас. Мы мелі выпадкі, што паасобныя комсамольцы хадайнічалі аб аслабаненьні арыштаваных і высланых кулакоў.

Работа з беднатой у існуючых колгасах і па-за колгасамі вядзецца надзвычайна дрэнна. Колгасьнікі бедйякі заяўляюць, што на працягу году ніякая работа з беднатою не праводзілася. Партыйныя і комсамольскія ячэйкі, а таксама РК КП(б)Б і РК КСМ не кіравалі работай з беднай і тым самым праводзілі правы ўхіл на практыцы. **С. Ф. С.**

А КОМСАМОЛ... СЬПІЦЬ

Комсамольскія ячэйкі Чэрвенскага раёну падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі не заняліся. Толькі 4 ліпеня на бюро РК ЛКСМБ быў заслухан даклад аб уборачнай кампаніі, якое вынесла прыгожую рэзолюцыю, якая на месцы **яшчэ не разаслана.** На нараду сэкратароў ячэек па пытаньню ўборкі зьявіліся з 23 сэкратароў толькі 6.

Юшкевіч.

* * *

Комсамольская ячэйка колгасу імя 10-годзьдзе БССР Магілеўскага раёну **абвясьціла сябе ўдарнай у падрыхтоўцы і правядзеньні ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі,** а таксама ў пабудове сілосных ям і пабудовы сьвінарніку.

М. Снапкоў.

Пляв, які захованы ў стале тав. Лосева

Віцебскі АК ЛКСМБ працуе па старынцы, як і раней і **ператвары́ўся ў штампавальную ўстанову:** друкуе атрыманыя цыркуляры, накіроўвае іх у раёны і г. д. А вось як гэтыя дырэктывы выконваюцца, дык гэта ня справа АК. Надамо факты.

Запыталі мы ў загадчыка с-г. сэктару АК тав. **Лосева** ці ёсьць у АК конкрэтны плян уборачнай кампаніі і што ў гэтым напрамку зроблена? Лосеў адказаў так: **плян ёсьць, але няма ключа і я не пакажу яго табе, а лепш раскажу, што намечана па пляну зрабіць**“. Дык вось кажа т. Лосеў: усе дырэктывы, якія паступаюць у АК, разасланы на месцы. Таксама накіраваны ад АК ЛКСМБ і „Віцебскага Пролетарыя“ 10 брыгадзіраў. Што яны зрабілі на масцох—ніякіх зьвестак няма, за выключэньнем невялікіх артыкулаў у газэце.

Аб тым, які ўдзел прымае комсамол у падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі, што зроблена комсамолам па сілосаваньню, сельгасп. сэктар АК нічога ня ведае і нават лічыць, што не абвязкова яму ўсё гэта ведаць(!?).

У справе дапамогі гарадзкіх ячэек вясковым ячэйкам ва ўборачнай кампаніі нічога ня зроблена. Рабочых брыгад па рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару няма.

Брыгадзір „Ч. З.“ **Лук'яновіч**

А. Вілін

Шахта „Марыя“

ВЫБУХ НА ШАХЦЕ*)

Яшчэ зусім нядаўна ўсе газэты Саюзу абляцела сумная тэлеграма:

Катастрофа на шахце „Марыя“.

Выбух на шахце—няшчасны выпадак.

Комсамольцы шахты ў часе катастрофы праявілі гэроізм у выратаваньні зажыва пахаваных, задушаных ды параненых.

Мы апавядаем у гэтым нарысе пра сапраўдных гэрояў пролетарскага Донбасу—пра комсамольцаў-гэрояў.

Комсамольская ячэйка шахты „Марыя“ мае сваю гісторыю. Пэрыоды ўздыму чаргаваліся з заняпадамі. Гарачы і заўзяты энтузіязм, які нараджаў пекныя справы, зьмяніўся ячэйковай цішынёю і разбэшчанасьцю хлапцоў.

Колішняя кіруючая часьціна ячэйкі—бюро, як гаворыць комсамолец Жэланьнікаў „засыпалася“. За „штылем“ у рабоце пачаліся непаладкі і нарэшце „бюро збочыла з клясавых позыцый“ (Пратакол бюро райкому ЛКСМУ).

Пераабралі... Некаторых выключылі з комсамолу і партыі. Цяпер сакратарствуе малады энэргічны комсамолец—член партыі, машыністы зарубнай машыны Сымон Коган. На працягу кароткага часу ячэйка вырасла на 80 чалавек. Організавалі комсамольскую брыгаду з 30 комсамольцаў і 70 чалавек беспартыйнай моладзі. Вучастак брыгады паганы, бываюць завалы, умацаваньне ня трымае ды інш. Але што азначаюць гэтыя драбніцы ў параўнаньні з бурлівым націскам комсамольскай сілы? Комсамольцы дамагліся выкананьня заданьня на 120 проц. Прарыў, які здарыўся на шахце, быў ліквідаваны комсамольцамі. За гэта ячэйка атрымала ўзнагароду ад саюзу гарнякоў—чырвоны сьцяг.

У траўні зламаўся вал. Шахта выбыла са строю.

Аднавіць шахту ў страі—лёзунг комсамольцаў. Была організавана дэманстрацыя комсамольцаў, якія абышлі ўсе шахты Першамайскага крыля. Дэманстрацыя прыцягнула моладзь на барацьбу з прарывам, які здарыўся з прычыны аварыі на шахце „Марыя“.

Такая яна—скромная гісторыя комсамольскага колектыву шахты „Марыя“.

І раптам—катастрофа.

Катастрофа яшчэ раз давяла, што комсамольцы ня проста — „вясёлыя хлопцы“, а баявы авангард моладзі, здольныя на гэроізм; хлопцы загартаваныя, як... чэрці.

Комсамольцы і гарнякі Донбасу павінны ведаць сваіх гэрояў з шахты „Марыя“.

Сымон Коган, малады хлопец, чорны ад засмаленьня, з вугластым тварам і надзвычайна выразнымі вачыма намагаецца гаварыць спакойна, але ўсплываючая ў памяці нядаўная катастрофа запальвае яго і словы нясуцца бураю, прыгожаю бураю комсамольскага пачуцьця.

— Вялізэзны слуп пораху над капром. Голас! Я зразумеў. Здарылася няшчасьце. На працягу дзьвёх-трох хвілін мы зорганізавалі з комсамольцаў ударную брыгаду для ратунку. Частка комсамольцаў прыбегла з ячэйкі, а шмат хто выбег з натоўпу, які сабраўся ля капра.

Цьвёрдасьць, якая была праяўлена організатарамі брыгады, надавала бадзёрасьці. Калі нас сабралася 25 чалавек, мы гукнулі

— Хто з намі? Хто апусьціцца ўніз ратаваць людзей, таварышоў, братоў!?

Адгукнуліся 4 чалавекі з старых. Яфрэмаў, комуністы, рабочы шахты, Кушнараў—машыністы зарубнай машыны, Рабенка—сэкратаа шахткому і Шкрэдкаў Патро—стары забойшчык.

Мы ўвайшлі ў клець, каб спусьціцца ў шахту.

Спушчаемся. Міг здаецца годам...

Спусьціліся...

Выскакваем, кідаемся да штрэку, апавітыя дымам і порахам...

Што было потым, уяўляю няясна.

Памятаю, што па дарозе натрапілялі на людзей, якія задыхаліся, мы цягнулі іх да стаўбура, адначасна самі асьвяжаліся вадою. У адным месцы выцягнулі з-пад паражняка стагнаўшага канагона.

Газу ў „штрэковай“ было нямала. Некаторыя нашы хлопцы пачалі задыхацца. Іх борзда асьвяжалі вадой, прыцягваючы да стаўбуру. У дыме, задыхаючыся, ахопленыя чорным жахам, бязупынна працуючы, мы выратавалі 9-10 чалавек ад сьмерці.

Трэба адзначыць адважную, сапраўды баявую комсамольскую цьвёрдасьць комсамольцаў з брыгады.

Вось яны—слаўныя таварышы.

Жэланьнікаў — лябёднік, загадчык АПА ячэйкі.

Дубіна—забойшчык, заг. эко ячэйкі, організатар комсамольскай брыгады.

Шэрсьцюк Пятро—памоцнік вучастковага тэхніка, баявы комсамолец, ужо раз папярэдзіў катастрофу на шахце, у момант, калі загарэўся матор.

Грызлоў Алёша—мацаўшчык, старшыня ячэйковай лёгкай кавалерыі.

Кагановіч Майсей—студэнт, комсамолец, практыкант політэхнічнага інстытуту.

Какарэнуо Алесь—мацаўшчык.

Маўчанаў Аляксей—сэкратар цэх. ячэйкі гарнага прамвучу.

Ушаноў Янка—машыністы зарубнай машыны, ячэйковы актывісты.

Іншыя гэтак сама не адсталі ад памянёных. Мы ўсё змагаліся з отыхіяй—як чэрці.

Калі праз 7 хвілін пасьля выбуху прыбегла выратоўчая каманда ў рэсьпіратарах, мы з шахты ня вылезьлі. Паколькі нам праз газ бяз масак ісьці нельга было, мы пачалі пераносіць людзей...

* * *

Вецер ціха гайдае чорнае палотнішча над капром шахты. Нячутна звычайнага гудзеньня, скрыпу, стогну вугольля, што осыпаецца з эстакад. На панадворку клюбу суроваю перасьцярогаю і страшэнным дакорам усім нам, а каму-небудзь і пэрсональна, узьнімаецца братэрская магіла...

Магіла кліча:


— да большай увагі пытаньню тэхнікі бясьпекі

— да барацьбы за культурнага шахтара.

Магіла кліча закончыць справу, за якую змагаліся ўдарныя шахтары, пахаваныя ў ёй.

Тысячы, дзесяткі тысяч шахтароў ужо адгукнуліся на заклік. Горлаўцы, Доўжынцы, Тошкаўцы, Бранцы, Сталінцы, Ліобычанцы і Гарнякі іншых вугольных раёнаў і месц на сваіх жалобных мітынгах выказвалі жаль з прычыны гібелі шахтароў на працоўным фронце. Яны запэўніваюць партыю, што выканаюць узяты на сябе абавязак—вугольную пяцігодку ў тры гады.

*) Перадрукавана з газэты „Комсомолець України“



Комсамольцы ТД-авіяхімаўцы Егор'еўскай тэкстыльнай фабр... ва ўдарным парадку пабудавалі першы планэр. Плянэр назв... імем 16 партзьезду.

На здымку: плянэрысты вядуць плянер да месца пуску.

РЫХТУЙЦЕСЯ ПРЫНЯЦЬ УРАДЖАЙ

(Канец. Пачатак гл. ва ўчарашнім № „73“)

Кулацкія гаспадаркі павінны выканаць цьвёрдыя заданьні па продажы хлеба. Тут трэба праявіць клясавую непрымірымасьць і політычную выразнасьць у рабоце. Ні ў якім выпадку нельга дапускаць таго, каб цьвёрдыя заданьні распаўсюджваліся на серадняцкія гаспадаркі. Вурокі мінулага году павінны быць поўнасьцю ўлічаны.

Комсамольцы гораду, на дапамогу вёсцы!

Вялікую дапамогу вёсцы могуць і павінны аказаць гарадзкія організацыі комсамолу і піонэраў. Ужо цяпер трэба падняць грамадзкасьць на збор мяшкоў. Недахоп тары зьяўляецца вельмі сур'ёзнай перашкодай пасьпяховасьці хлебазагатовак і дастаўкі хлеба ў прамысловыя цэнтры. Чыгуначныя ячэйкі павінны дабіцца выразнасьці ў рабоце кіруючых апаратаў і службаў па частцы перавозкі хлеба. Трэба дабіцца дакладнага выкананьня плянаў перавозак і тэрміновай адпраўкі хлеба па назначэньню.

Складачныя памяшканьні і ахова збожжа—адно з асноўных зьвеньняў у падрыхтоўцы прыёму ўраджаю. Трэба загадзя вызначыць месцы, дзе будзе рабіцца ссыпка хлеба. Нельга дапускаць выпадкаў ссыпкі хлеба ў царквах, не атрымаўшы на тое згоды грамадзян. Трэба быць вельмі асьцярожн... каб ня выклікаць эксцэсаў, як... маглі прывесьці да нежаданых ... нікаў.

Комсамольскія організацыі па... ны загадзя даць кадр рахунк... даў прыёмшчыкаў на ссыпныя ... кты, загадзя падрыхтаваўшы іх ... гэтай работы. Трэба вызнач... добра вытрыманых актывістых-к... самольцаў на заг. ссыпных п... таў.

Падрыхтоўчая работа пав... быць пачата зараз-жа. Падрыхто... павінна ісьці па двух лініях: ... лініі разгортваньня масавай раб... ў вёсцы і організацыйна-выт... чай дзейнасьці кооперацыйных ... ганізацый. **Трэба растлумач... колгасьніку і індывідуальн... што сваечасовая здача та... ных лішкаў узмацняе нашы ... зіцыі ў соцыялістычным ... даўніцтве.** На конкрэтных ... кладах нашага будаўніцтва ... паказаць тое, што патрэбен ак... ны ўдзел самага сялянства ў г... будаўніцтве. Комсамольскія ор... зацыі павінны дабівацца, каб ... спаборніцтва стала асноўным ... дам работы ня толькі загато... апаратаў, але і ўсіх організа... якія прымаюць удзел у праве... ні хлебазагатовак.

Мы супроць крывавай расправы над Гіршам, Югэндам і Пропэрам!

6-га ліпеня ў кіно-тэатры „Культура“ адбыўся інтэрнацыянальны вечар протэсту менскага мопр'аўскага актыву супроць зьверскага прысуду польскіх фашыстых над трымя львоўскімі комсамольцамі. Адначасова ён быў прысьвечаны сустрэчы курсантаў міжнароднай Ленінскай школы—прадстаўнікоў компартыі Францыі, Італіі, Польшчы і інш. краін, якія прыехалі на Беларусь, каб азнаёміцца з яе дасягненьнямі ў соцыялістычным будаўніцтве.

Львоўскі прысуд над нашымі ленінымі таварышамі—Гіршам, Югендам і Пропэрам зьяўляецца адказам польскага фашызму на ўзрастаючы рэволюцыйны рух Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны,—заявіў прадстаўнік ЦК МОПР'у Беларусі тав. ЦУДЗІН, які адкрыў сход.

Львоўскі прысуд зьяўляецца сыгналам падрыхтоўкі да ўзброенага нападу на бацькаўшчыну сусьветнага пролетарыяту—СССР. Буржуазія імкнецца пазбавіць тыл ад рэволюцыянэраў. Але мы гатовы ў любую хвіліну стаць на абарону сваіх межаў, на абарону нашых лепшых замежных таварышоў!

Пад шумныя воплескі абіраецца прэзыдыум: члены ЦК і акругкому МОПР'у і прадстаўнікі братэрскіх компартый—Францыі, Італіі і інш. краін.

Далей сход заслухоўвае інформацыю піонэркі Шушковай аб незапушчэньні савецкай дэлегацыі піонэраў на народны дзіцячы зьлёт, які адбу... ца ў горадзе Гаазе.

— Буржуазія дайшла да таго, ... баіцца дапускаць нават нас—юны... онэраў. Гэта яскрава сьведчы... тым, што дні яе ўжо зьлічаны... яўляе тав. Шушнова.

Аднагалосна прымаюцца рэзол... протэсту супроць крывавага пр... над Гіршам, Проперам і Югенд... супроць недапушчэньня нашых ... гатаў на міжнародны дзіцячы зь...

Бурнымі воплескамі сустрак... выступленьне прадстаўніка фра... кай компартыі тав. Гарн'е. Незра... лая мова. Але ўздымная інто... энэргічныя і выразныя гэсты і ... агульна-зразумелыя словы, як „... ністыша“, „соцыяль“, „Комін...“ „Рэволюціён“ і шмат інш. кажу... тым, што прамоўца гаворыць аб ... ім блізкім і дарагім.

— Братэрскае прывітаньне ра... і сялянам Беларусі ад рабочых ... лян Францыі!.. Мы ад усяго сэр... лучаемся да вашага рашучага ... сту супроць фашысцкай рас... над Гіршам, Югэндам і Пропэ... Далоў фашызм! Далоў імпэры... Няхай жыве сусьветная рэвал... Так закончыў сваю прамову т. ...

Ад італьянскай компартыі ... паў тав. Маравіні, ад гішпанска... варыш Сумбі, ад польскай т. Пя...

Хмар...

За мяжою

Крывавыя сутычкі паміж паліцыяй і рабочымі

ВЕНА, 5. Па паведамленьню з Баўгарыі, у знак протэсту супроць павялічэньня рабочага дню і зьніжэньня зарплаты 6500 табачнікаў Хаскова 4 чэрвеня абвясьцілі аднадзённую забастоўку. Па патрабаваньню прадпрыемцаў на фабрыкі зараз-жа зьявіліся войскі, адбылася крывавая сутычка. Ня гледзячы на страляніну, рабочыя сілай пракла... лі сабе дарогу з фабрык. Сутычкі адбываліся на вуліцы і цягнуліся ў розных частках гораду цэлы дзень. Ёсьць маса раненых шаблямі і кулямі. Провокацыя войск выклікала моцнае абурэньне сярод насельніцтва. Працоўнае насельніцтва падтрымлівала бастуючых. Забастоўкай кіравалі рабочая партыя і незалежныя профсаюзы Баўгарыі.

Чырвоная армія Кітаю заняла шэраг новых гарадоў

ШАНХАЙ, 5. Паводлуг наступаючых вестак, Чырвоная армія ўмацавалася ў розных мясцох на ўзьбярэжжы ракі Янцзы. Нядаўна атрадамі Чырвонай арміі заняты Іочжоу (на мяжы Хунаньскай і Хубэйскай провінцыі), Чэнлінчжы, Суцзі. Армія набліжаецца да Шашы (провінцыя Хубэй). Японскае агенцтва паведамляе, што амэрыканскія і брытанскія зьнішчальнікі вышлі з Ханькоу ў раёны разьмеркаваньня чырвоных войск.

Чырвоная армія Кітаю заняла ...чжоу

ЛЁНДАН, 6. Па паведамленьню з Ханькоу ангельская канонерка была абстрэлена на рацэ Янцзы атрадамі кітайскай чырвонай арміі, якія занялі ...чжоу на граніцы Хунаньскай і Хубэйскай провінцый. Канонерка адказвала на выстрэлы. З Ханькоу пасылаецца ангельскае ваеннае судно.

Новы міністр прыступіў да сваіх „абавязкаў“

ГЭЛЬСІНГФОРС, 6. Новы міністр унутраных спраў загадаў арыштаваць усіх комуністычных дэпутатаў. Як паведамляе друк, паліцыі пакуль што не ўдалося арыштаваць ніводнага з іх. Дэпутаты сойму, забраныя ўчора, дастаўлены ў Лапуа (цэнтр фашысцкага руху), дзе ўсіх арыштаваных дапытаюць і адпраўляюць на граніцу СССР.

„ДЗЕНЬ ГАНДЗІ“ У БОМБЕІ

ЛЁНДАН, 6. У Бомбеі, у сувязі „з днём Гандзі“ (ужо мінуў месяц, як Гандзі пасадзілі ў турму), адбыліся значныя дэмонстрацыі. У дэмонстрацыях прыняло ўдзел шмат рабочых. Баставалі рабочыя 49-ці тэкстыльных фабрык. Забаставаўшыя прайшлі па вуліцах з нацыянальнымі сьцягамі.

Дэмонстрацыя протэсту супроць сьмяротных прыгавораў

ПАРЫЖ, 5. У Лілі ля памяшканьня польскага консульства адбылася дэмонстрацыя протэсту супроць сьмяротнага прыгавору тром комсамольцам у Львове. Дэмонстранты выбілі шыбы ў памяшканьні консульства.

38 індакітайскіх рэволюцыянэраў загінулі пад нажом гільотыны

ПАРЫЖ, 3. Прыгавораныя да сьмяротнага пакараньня 38 індакітайскіх рэволюцыянэраў, даведаўшыся аб пакараньні сьмерцю іх 4-х таварышоў, абвясьцілі галадоўку протэсту. У гэты час ужо быў зацьверджан такі самы сьмяротны прыгавор галадаўшым, якія праз некалькі дзён таксама загінулі пад нажом гільотыны.

Замежныя комсамольцы і комуністыя вітаюць 16 зьезд УсеКП(б)

БЭРЛІН, 6. Конфэрэнцыя комсамольскіх організацый 14 важнейшых эўропэйскіх краін з удзелам прадстаўнікоў 6-ці комуністычных партый, якая закончылася, зьвярнулася з вітальнай тэлеграмай да 16-га зьезду Усе КП(б).

Адказны рэдактар Рэдколегі...

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 59 9